ДУА “Залеская дзіцячы сад-сярэдняя школа Глыбоцкага раёна”
Віцебскай вобласці

**Рэспубліканскі конкурс**

***“Дарогамі памяці”***

**Намінацыя** ***“Гісторыя вайны ў асобах”***

# “Залесчына…
# Лёсы нашых землякоў у часы Вялікай Айчыннай вайны…”



**Творчая група ўдзельнікаў аб’яднання па інтарэсах “Юныя краязнаўцы” Залескай сярэдняй школы**

**Кіраўнік: настаўнік Шарыпкін Рыгор Леанідавіч**

**2018 г.**

# ЗМЕСТ

**Уступнае слова____________________________________________________с.1**

**I. Акупацыя. Трагедыя сям'і Пачопка Валянціны Нікандраўны_______ с.2-3**

**II. Партызаны. Партызанская сям'я Кошалевых____________________ с.4-7**

**III. У нямецкай няволі. Дзяцінства ў прымусовым працоўным лагеры.**

**Лёс Селязень Валерыі Філіпаўны___________________________________с.8-11**

**IV. Пераможцы. Баявыя шляхі нашых землякоў. Кухта Генадзь Сямёнавіч: з партызанскіх лясоў да Берліна__________________________________ с.12-13**

**Кухта Васілій Міхайлавіч: ён фатаграфаваўся на лесвіцы рэйхстага_ с.14-15**

**Пасляслоўе. Дарогамі памяці. Помнікі сведчаць…_________________с.16-17**

# Уступнае слова

…З моманту Вялікай Перамогі, з дня 9-га мая 1945 года, ужо хутка міне 73 гады. Час няўмольны, і нават тым людзям, што нарадзіліся ў 1945 годзе, на сённяшні дзень спаўняецца 73…

Тым, хто ў 1941-ым годзе ў 18-гадовым узросце пайшоў ваяваць на фронт з акупантамі, на сённяшні дзень павінна б споўніцца 95 гадоў…

Гэтыя ўзроставыя лічбы сведчаць аб тым, як мала застаецца сёння сярод нас жывых сведкаў апошняй страшнай вайны.

У Залескім сельсавеце жыве апошні ветэран Вялікай Айчыннай вайны, той чалавек, які ваяваў, які на свае вочы бачыў тую вайну…

Наша даследчая праца адкрывае праўду аб вайне вачамі непасрэдных яе сведкаў і расказвае іх вуснамі. У аснову гэтых гісторыка-краязнаўчых аповедаў ляглі ўспаміны тых людзей, нашых землякоў, якія яшчэ жылі напачатку нашага XXI стагоддзя… Зараз нікога ўжо няма… Засталіся толькі запісаныя іх аповеды, фотаздымкі сустрэч у нашым школьным краязнаўчым музеі, архіўныя фотаздымкі і дакументальныя матэрыялы, калісьці перададзеныя імі для музея, даследчыя працы краязнаўчага гуртка па гісторыі Вялікай Айчыннай.

Наша "Гісторыя вайны ў асобах" паспрабуе расказаць аб тым, які лёс быў наканаваны землякам з Залесчыны ў 1941-1945 г.г.

Адным давялося перажыць страшныя часы фашысцкай акупацыі…

Нехта ваяваў у партызанах…

Многія дзеці на той час памяталі сваё дзяцінства ў нямецкіх прымусовых працоўных лагерах…

Моладзь, якая перажыла акупацыю, з ліпеня 1944-га змагалася з фашыстамі на франтах…

У кожнага быў свой лёс…

І пра гэтыя лёсы мы раскажам у сваёй даследчай працы.

Змест нашага даследавання пабудаваны ў выглядзе гістарычных нарысаў у чатырох частках; у кожным нарысе расказваецца аб тых, хто перажыў і зведаў усе жахі акупацыйнага рэжыму, хто дзейнічаў у партызанскім атрадзе, хто прымусова быў вывезены на працу ў Германію, хто здабываў Вялікую Перамогу на фронце…

Усе прадстаўленыя ў нашай працы матэрыялы, успаміны, фотаздымкі і дакументы – сапраўдныя, вынік даследчай дзейнасці школьнага музея і краязнаўчага гуртка "Юныя краязнаўцы" па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Кіраўнік праекту: загадчык гісторыка-краязнаўчага музея
"Мінулае Залесчыны",
кіраўнік аб'яднання па інтарэсах
"Юныя краязнаўцы",
настаўнік рускай мовы і літаратуры
Шарыпкін Р.Л.

# *І. АКУПАЦЫЯ*

## Трагедыя сям'і Пачопка Валянціны Нікандраўны



**Пачопка (Мірош) Валянціна Нікандраўна, адзіная выжыўшая з сям'і, расстралянай немцамі у лютым 1943-га…**

У лютым і сакавіку 1943 года здарыліся адна за другой дзве трагедыі ў вёсцы Лучайка. Партызаны падтрымлівалі сувязь з многімі сем'ямі, бо трэба было нечым харчавацца, атрымліваць патрэбную інфармацыю. У хату да Нікандра Іванавіча Міроша за вёскай Лучайкай партызаны наведваліся ўжо даўно – лес побач, сядзіба гаспадара стаіць на ўскрайку вёскі, адасоблена. Для партызан сям'я пякла хлеб. Аднак у вёсцы доўга нешта скрываць немагчыма: знайшоўся пільны "добразычлівец" з мясцовых, які паведаміў у паліцыю аб начных візітах партызан. У сям'і Нікандра і яго жонкі Алены выхоўваліся двое дзяцей – маленькая Фаня, якой на той час было 8 гадоў, і старэйшая – Валя.

Якраз перад гэтымі падзеямі бацька адправіў Валянціну да роднай цёткі ў вёску Валодзькава, што каля Гатаўшчыны. Трэба было дапамагчы ёй па гаспадарцы, ды і абяцала цётка аддзякаваць прадуктамі сям'і брата.

…Немцы з паліцыяй наляцелі на вёску раптоўна, раніцай. Ачапілі падвор'е, папярэдне сагнаўшы да двара Нікандра мясцовых жыхароў – на паказальную расправу. Сям'ю вывелі з хаты і ўсіх пастроілі. Прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі дасталі спіс членаў сям'і, зверылі, зачыталі пастанову аб расстрэле за сувязь з партызанамі. Замест Валянціны сярод выведзеных членаў сям'і стаяла зусім чужая жанчына – Сапрон Варвара. Яшчэ ўвечары мясцовая жабрачка зайшла ў хату Нікандра, папрасіўшы паесці і пераначаваць да раніцы. Няшчасная жанчына галасіла і спрабавала даказаць немцам, што яна – зусім чужы і выпадковы чалавек у гэтым доме, аднак акупантаў гэта зусім не турбавала: па спіску – чатыры душы, на расстрэл выгнаны – чатыры… Якія могуць быць пытанні? Усе чацвёра былі забіты тут жа, каля хаты: бацька Нікандр, яго жонка Алена, маленькая дачка Фаня, жабрачка Варвара…

Калі чуткі аб гібелі родных дайшлі да Валянціны, яна пешшу пайшла дамоў. Забітых пахавалі аднавяскоўцы ў адной магіле. Дзяўчыне невыносна было заставацца адной у хаце, яна ў адчаі рашылася на неверагоднае: пайшла ў валасную ўправу ў Залессе, дзе і сказала, што яна – адзіная ўцалеўшая з расстралянай сям'і. Дзіўна, але ўлады зрабілі наступнае: дасталі спіс расстраляных, праверылі, махнулі рукой – "Ідзі дадому, ты нам ўжо не патрэбна…"

У родны дом Валя не вярнулася, прытулілі людзі. А праз месяц дзяўчыне зноў давялося перажыць чарговую трагедыю роднай вёскі, толькі цяпер ужо ўсё яна бачыла сваімі вачыма. У сакавіку 1943-га ў Лучайку прыехала машына з салдатамі. Выкуліліся, ачапілі мясцовасць, усіх людзей пагналі пад вёску Сасноўка. Усіх сабралі каля хаты Жука Уладзіміра. З дому сталі выводзіць усю сям'ю. Асобна немцы аддзялілі і паставілі ўбаку іх сына Мечыка (Мечыслава). Як ужо потым даведаецца Валянціна і іншыя жыхары, сын Уладзіміра ваяваў у мясцовым партызанскім атрадзе, ноччу папалі ў паліцэйскую засаду, Мечык здолеў паранены ўцячы і да раніцы прыбіўся дадому. Ці нехта выгледзеў і данёс, ці ў немцаў была інфармацыя… На вачах Мечыслава і вяскоўцаў усю яго сям'ю па двое сталі выводзіць у паветку і пачалі страляць… Пасля расстрэлу ўсім загадалі разыйсціся па дамах. Жук Мечыслаў пасля допытаў і катаванняў быў забіты акупантамі 28 сакавіка 1943-га года ў Беразвецкім барку…

…Валянціна Нікандраўна Пачопка памерла ў 2007 годзе.. За вёскай знаходзіцца помнік на месцы жудаснай трагедыі, у выніку якой яна страціла ўсіх сваіх родных. Дома ў яе захоўваўся выпадкова толькі адзін прыжыццёвы фотаздымак маці, яшчэ зусім маладой, за 1916 год…




**Помнік на месцы гібелі сям'і Пачопка (Мірош) Валянціны Нікандраўны (в. Лучайка)**



**Помнік на месцы гібелі сям'і Жука Мечыслава Уладзіміравіча (в. Сасноўка)**

# *II. ПАРТЫЗАНЫ*

## Партызанская сям’я Кошалевых

За час фашысцкай акупацыі насельніцтва Залесчыны спаўна зведала жах пры ўпамінанні аднаго толькі імя – Вятвіцкі… Яго добра ведалі ў Глыбокім і ва усім наваколлі яшчэ да вайны. Памяталі Вятвіцкага як надзвычай элегантнага і артыстычнага чалавека, які на нядзельных кірмашах у Глыбокім ладзіў цыркавыя выступленні. Ён свабодна валодаў чатырма мовамі. Нейкі час жыў у Бушыках. Ажаніўся на маладзіцы з вёскі Мярэцкія. У канцы верасня 1939-га года Вятвіцкі быў арыштаваны органамі НКУС, змешчаны спачатку ў Беразвецкую турму. Аказалася, што ўвесь гэты час паважаны спадар Вятвіцкі дзейнічаў у Глыбокім як тайны рэзідэнт нямецкай разведкі. Перад вайной “цыркача” абмянялі на палоннага савецкага разведчыка. І вось з пачаткам фашысцкай акупацыі Вятвіцкі з’явіўся на “арэне” жыцця ў Глыбокім у чыне маёра, кіраўніком аддзела па ідэалогіі ў гебітскамісарыяце, адказным па справах моладзі. Гэты жудасны чалавек ведаў усіх, і цяпер, надзелены неабмежаванай уладай, помсціў усім, не шкадаваў нікога, з вялікім “задавальненнем” удзельнічаў у карных расправах, садысцкія фантазіі яго не мелі межаў… Па яго загаду быў спалены дом і расстраляна сям’я Альсевічаў з вёскі Ячышча. Вятвіцкі уласнаручна забіў двух яўрэяў з вёскі Лужкі (бацьку і дачку) на беразе возера Мураўшчына за вёскай Загор’е, а потым загадаў утапіць целы няшчасных на балоцістым беразе ў багне (жона дастала рэшткі мужа і дачкі толькі ў 1946 годзе). У вёсцы Азерцы Вятвіцкі забіў Рэкуць Браніслава і на вачах яго жонкі скінуў цела ў яму, запоўненую вадой, пад пагрозай расстрэлу не дазваляў пахаваць нябожчыка па-людску. Аб усіх гэтых фактах расказваў жыхар вёскі Залессе-Астроўна Ляшонак Уладзімір Іванавіч, які ведаў Вятвіцкага асабіста.

У маёнтку графа Молле немцамі быў створаны паліцэйскі гарнізон. Самаахоўцы-паліцаі неслі патрульную службу, рабілі вобыскі, удзельнічалі ў сумесных з немцамі карных аперацыях. Непасрэдна кіраванне паліцэйскім гарнізонам у Залессі ўзначаліў Вятвіцкі.



**Палац у маёнтку Залессе-Астроўна (фотаздымак 1936-га года). У гэтым будынку ў 1941-1944 г.г. размяшчаўся паліцэйскі гарнізон, знішчаны у чэрвені 1944-га партызанамі пад кіраўніцтвам нашага земляка – Кошалева Георгія Фёдаравіча.**

Да пачатку 1942 года на Глыбоччыне з'яўляюцца першыя партызанскія атрады, пачынаецца арганізацыя і стварэнне партызанскай зоны. На Віцебшчыне брыгадай імя Ракасоўскага камандуе Пётр Міронавіч Машэраў. Адзін з атрадаў гэтай брыгады – атрад імя Ахоціна - дзейнічае ў межах Расон, Полацка, Глыбокага. Камандзірам атрада стаў наш зямляк, былы старшыня Залескага сельсавета ў 1939-1941 г.г. Кошалеў Георгій Фёдаравіч. У атрадзе разам з бацькам ваявалі яго сыны – Віктар і Мікалай. А іх маці – Анастасія Данілаўна – дзяліла ўсе цяжкасці партызанскага жыцця, была ў атрадзе прачкай і поварам.

Успамінае нявестка Георгія Фёдаравіча, Кошалева Лідзія Сямёнаўна, жыхарка в. Залессе: *"З сынам славутага камандзіра партызанскага атрада Георгія Фёдаравіча Віктарам мы пажаніліся адразу пасля заканчэння вайны.*

*Мой будучы муж атрымаў першае баявое хрышчэнне яшчэ ў 1941 годзе, калі ён прымаў удзел у эвакуацыі калгасных статкаў, пераганяючы іх у накірунку Вялікіх Лук. Далучыліся да адступаючых часцей Чырвонай Арміі. Два тыдні Віктар праходзіў баявую падрыхтоўку, пайшоў на фронт, але ў баях пад Псковам атрымаў цяжкае раненне. Пасля шпіталю накіравалі ў партызанскі атрад у раёне Расон, дзе быў камандзірам яго бацька. Там жа знаходзіўся і брат Мікалай. Ужо пасля вайны бацька і сыны былі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі "За баявыя заслугі". Брат Мікалай у пасляваенны час служыў на флоце, аднак трагічна загінуў на караблі пры вучэбных манеўрах у пачатку 1950-ых г.г. Ну, а з Віктарам, пажаніўшыся, мы пражылі ўсё жыццё ў Залессі... Пасля заканчэння вайны Георгія Фёдаравіча Кошалева абралі старшынёй калгаса "Новы шлях". У яго быў вялікі аўтарытэт сярод нашых людзей: яго памяталі яшчэ на пасадзе старшыні сельсавета да вайны, ведалі пра яго баявую дзейнасць у партызанах, пра яго кіраўніцтва атрадам".*







**Партызанская сям’я: Кошалеў Георгій Фёдаравіч, сыны Мікалай і Віктар**



У 1944 годзе, у ноч на Троіцу, з 3 на 4 чэрвеня партызанамі атрада імя Ахоціна было здзейснена начное нападзенне на паліцэйскі гарнізон у маёнтку Залессе. Аперацыяй кіраваў Георгій Фёдаравіч. У выніку начнога бою было забіта 10 паліцаяў. Частка здраднікаў збегла, астатніх партызаны раззброілі і пакінулі ў жывых. Потым, калі на другі дзень, раніцай, немцы праводзілі даследаванне абставін і “ганебнага” разгрому гарнізона, асабіста вёў допыт раззброеных паліцыянтаў Вятвіцкі, была праведзена запозненая аперацыя па вышуку, акружэнню і знішчэнню партызан, аднак народныя мсціўцы не былі знойдзены.

Глыбоцкі акруговы камісар Пауль Гахман у сваёй справаздачы Генеральнаму камісару Беларусі ў пачатку ліпеня 1944-га паведамляў наступнае: *“…Созданная в марте 1944 года Белорусская краевая оборона (БКО) ни в какой мере не была в состоянии покончить с бандитской деятельностью. “Оборонные деревни” и БКО подвергались таким внезапным нападениям большевистских банд, с которыми могли справиться только немецкие силы. Так, например, БКО в Залесье в течение короткого времени почти без сопротивления была уничтожена бандами…”*

У час таго начнога бою ў Залескім маёнтку былі забітыя многія аднавяскоўцы, што вымушаны былі служыць у гарнізоне: хто – пад прымусам, хто – па ўласнаму жаданню. Целы забітых немцы хавалі на могілках у в. Сасноўка, в. Мярэцкія, на Копцеўскіх могілках у Глыбокім.



**Памятная стэла на тэрыторыі**
**Залескай сядзібы ў гонар партызан,**
**разграміўшых у чэрвені 1944- га**
**паліцэйскі гарнізон**
**(устаноўлена ў 1975 годзе)**



Асобныя моманты падзей у палацы ў чэрвені 1944-га добра памятае Веньямін Дзмітрыевіч Пашковіч, 1934 г.н., жыхар в. Калеснікі. У 1941 і 1942 г.г. ён наведваў пачатковую школу, якая працавала пры акупантах і месцілася ў адной палове дома, дзе пры графу Молле жыла яго прыслуга. Другую палову будынка і падвальныя скляпенні займала малочна-таварная ферма. Веньямін Дзмітрыевіч кожны дзень меў магчымасць назіраць за службай паліцэйскіх у палацы. Ён дакладна памятае прозвішча кіраўніка паліцэйскага гарнізона ў Залессі – Аніськовіч Мітрафан, родам з Калеснікаў; неаднаразова бачыў і

Вятвіцкага. А потым Веньямін Дзмітрыевіч стаў і сведкам падзей, што адбыліся на наступны дзень пасля разгрому Залескага гарнізона партызанамі…

Раніцай сюды з’ехаліся немцы разам з Вятвіцкім. Той асабіста вёў допыт застаўшыхся ў жывых паліцэйскіх, потым загадаў усім стаць да сцяны палаца і нямецкія салдаты па яго камандзе далі чаргу з кулямёта…паверх галоў…”для папярэджання”. Справу па выкрыццю і пошуку “лясных бандытаў” хутка закрылі, не было на гэта часу, бо час ужо ішоў не на карысць немцам: хутка пачалася аперацыя “Баграціён”, а ўжо 3 ліпеня савецкія войскі вызвалілі ад фашыстаў Глыбоччыну.

•••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••••

**Веньямін Дзмітрыевіч Пашковіч,**
**выпускнік Залескай школы**
**1952-га года. Сустрэча**
**у школьным краязнаўчым музеі**
**у час запісу ўспамінаў аб**
**Вялікай Айчыннай вайне**

**(чэрвень 2016 г.)**




…Пасля вайны наш славуты зямляк, Георгій Фёдаравіч Кошалеў, узначаліў калгас “Новы шлях”, працаваў на пасадзе старшыні. У канцы 1950-ых г.г. працаўнікі нашага калгаса здалі дзяржаве ільну высокай якасці зверх планавых нормаў, за што Георгію Фёдаравічу выдзелілі прэмію ў памеры 5000 рублёў. Аднак ён, як сумленны чалавек, падзяліў усе грошы паміж звеннявымі: *“Маёй заслугі тут мала. Гэты лён вырасцілі калгаснікі”*. І гэта яшчэ адзін факт пра высакародны характар былога камандзіра партызанскага атрада.

… Георгій Фёдаравіч Кошалеў памёр у 1968 годзе. Яго пахаванне прайшло з адданнем воінскай пашаны: у траурнай цэрэмоніі ўдзельнічалі салдаты глыбоцкай вайсковай часці, якія неслі яго баявыя ўзнагароды; граў духавы аркестр. На месцы пахавання нашага славутага земляка ўстаноўлены помнік з чырвонай зоркай…



## *ІІІ. У НЯМЕЦКАЙ НЯВОЛІ*

**Дзяцінства ў прымусовым працоўным лагеры.**
**Лёс Селязень Валерыі Філіпаўны**

У вёсцы Бушыкі Залескага сельскага савета Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці жыла Валерыя Філіпаўна Селязень, 1937 года нараджэння. У 1955 годзе яна выйшла замуж за зухаватага электрыка Паўла, і неўзабаве маладая пара пераехала жыць у тыя мясціны, адкуль родам быў муж – на Глыбоччыну.

Толькі ў 1990-ых г.г. гераіня нашай даследчай працы была афіцыйна залічана да радоў тых людзей, якіх ушаноўваюць на Дзень Перамогі. Валерыя Філіпаўна не ваявала на франтах Вялікай Айчыннай, не была ў партызанах, не з’яўлялася удзельніцай падполля: на пачатак вайны, у 1941 годзе, ёй было толькі 4 гады. Аднак яна спаўна спазнала пакуты ваеннага ліхалецця, акупацыю, а потым – са студзеня 1944 года па май 1945 года – паўтара года знаходзілася ў Германіі ў прымусовым працоўным лагеры.



**Селязень Валерыя Філіпаўна**
**(фрагмент запісу ўспамінаў)**

Родам Валерыя Філіпаўна з Валожыншчыны: вёска Буні Сакаўшчынскага сельскага савета Валожынскага раёна Маладзечанскай вобласці.

…8 студзеня 1944 года ранкам сям’я Валерыі збіралася за святочны стол: пачынаўся 2-гі дзень Ражаства Хрыстова... Раптоўна па вуліцы затрашчэлі матацыклы, загулі машыны, у хаты пачалі ўрывацца нямецкія салдаты. Усіх жыхароў вёскі Буні зганялі ў цэнтр на плошчу, дзе іх ужо чакалі крытыя грузавыя машыны. Так пачалася імгненная аперацыя акупантаў па вывазу людзей у Германію.

Вёска Буні налічвала 50 двароў. Вывезены былі ўсе, хто на той ранак знаходзіўся ў паселішчы. Валерыя Філіпаўна ўспамінала, што ў той момант, як іх ужо павезлі, многія шчыра радаваліся, бо праязджаючы суседнюю вёску Кражына, было бачна, як гарэць падпаленыя немцамі дамы. Вёска Кражына была спалена поўнасцю разам з усімі жыхарамі...

З сямігадовага ўзросту падзеі тых дзён не маглі застацца ў памяці поўнасцю, аднак Валерыя Філіпаўна добра памятала, як немцы ўваліліся ў іх хату і з дапамогай паліцая аддалі загад: адзецца, узяць з сабою самае неабходнае – дакументы, і – на плошчу, да машын... Бацька паспеў схапіць з печы гарачы святочны сняданак – развярнуў кажух, на яго вывернуў чыгун з вараным мясам і закруціў хуталём.



Так уся сям’я Палуянчыкаў – бацька Філіп Лук’янавіч, маці Юзэфа Іванаўна, Валерыя і яе старэйшы брат Косця – “адправіліся ў падарожжа”, якое абернецца паўтарагадовым жыццём у бараках фашысцкага прымусовага працоўнага лагера...

...У Валожыне жыхароў вёскі Буні загрузілі ў вагоны-цялятнікі, куды ўжо былі панапіханы людзі з іншых паселішчаў. Цягнік пайшоў на Польшчу, а потым на Германію.

Сям'я Палуянчыкаў апынулася ў працоўным лагеры Будэльсдорф каля горада Рэйнсбург.

Жылі ў бараках, дзе ўнутры ўсё было падзелена дошкамі на закуткі, разлічаныя на дзве сям'і. Убранства кожнага закутка – двух'ярусныя паліцы.

Працавалі на заводзе, які вырабляў снарады. Бацька Валерыі высвярліваў снарадныя балванкі.





**Фотаздымкі з сямейнага архіву Валерыі Філіпаўны. Злева: Юзэфа Палуянчык і Дуня Гавінчык. Справа: дзеці Галіна, Валерыя і Канстанцін (Германія, Будэльсдорф, 1945 г. Фотаздымкі зроблены англійскімі салдатамі)**

Сям'я галадала... І не дзіўна: за працу ў лагеры бацька і маці атрымоўвалі міску баланды ў дзень і 600 грамаў хлеба на тыдзень, на Валерыю паёк не быў разлічаны, бо сямігадовая дзяўчынка не магла выконваць неабходную працу на заводзе, а, значыць, і не лічылася працаздольнай.

Дні таго страшнага часу ўсплывалі ў памяці Валерыі Філіпаўны ўрыўкамі, эпізадычна.

Валерыя Філіпаўна ўспомніла ў час запісу рэпартажу пра адзін выпадак. Гэта здарылася, калі бацька, у чарговы раз адбываючы свой працадзень на нямецкім заводзе, абтачваў загатоўкі для снарадаў на станку. Побач была і маленькая Валерыя. Раптоўна станок загрукатаў, затрашчаў, з яго паваліў дым – нешта сапсавалася. Імгненна наляцелі наглядчыкі, як казала Валерыя Філіпаўна, "стаялі колам вакол бацькі і яе і злосна гергеталі па-нямецку:

“Schwein! Russisch Schwein! Diversion!” Ледзьве адбаранілі ад раз’юшаных немцаў Філіпа Лук’янавіча яго таварышы па працы, паабяцаўшы адрамантаваць станок...

У барачным адсеку сям’я Валерыі Філіпаўны жыла разам з сям’ёю Дуні Гавінчык. З ёю былі таксама двое дзетак: дачка Галя - аднагодка Валерыі, сын – равеснік Валерынага брата Косці. Сябравалі і разам пераносілі цяжкасці зняволення.

Вызваленне прыйшло ў маі 1945 года. Вызвалілі з лагера англійскія салдаты. Былым вязням лагера Будэльсдорф англічане выдалі цёплае адзенне, прадуктовы паёк, і пасля афармлення неабходных дакументаў беларускія сем’і пацягнуліся дадому – хто як мог і на чым мог... Спяшаліся, бо гаспадара дома чакала надзея на адноўленае жыццё. Дзіўна, калі мы пачулі ад Валерыі Філіпаўны расказ пра тое, як імкнулася сям’я Палуянчыкаў паспець на радзіму, каб засеяць зямлю, нешта пасадзіць... Вось яна – жыццёвая прага беларуса да працы, да сваёй зямлі пасля шматмесячнага існавання пад пастаяннай пагрозай смерці ў зняволенні!

На мяжы з Польшчай сям’ю Палуянчыкаў і іншых вяртаўшыхся чакала “фільтрацыя”. Валерыя Філіпаўна ўспамінае, як муштравалі бацьку органы НКУС: “Як апынуліся ў Германіі? Ці быў гэта добраахвотны выезд? Чаму вы уцалелі, а суседнюю вёску спалілі? Што бачылі ў Нямеччыне?” Гэтыя допыты і пастаянная падазронасць бянтэжылі людзей, што так імкнуліся хутчэй вярнуцца у родныя мясціны. У роднай вёсцы сям’я Валерыі Філіпаўны была якраз на Купалле – у пачатку ліпеня. І хоць позна было ўжо сеяцца, аднак зрабілі і гэту справу... Што ж было потым? Юнацтва на Радзіме, знаёмства з Селязнём Паўлам, жаніцьба, прыезд маладой сям’і ў 1955 годзе ў вёску Бушыкі, праца на зямлі, нараджэнне дзетак (тры сыны і дачушка), чаканне ўнукаў і ўнучак... Так прайшоў час.

Пра тое, каб малалетніх вязняў фашысцкіх працоўных лагераў афіцыйна прыраўняць да ліку людзей, лёс якіх цесна быў звязаны з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, у 1950 – 1980-ых г.г. не было і гаворкі. Толькі на пачатку 1990-ых г.г. пачалі ўздымацца пытанні аб іх ушанаванні. Пачынае працаваць і аказваць матэрыяльную і маральную кампенсацыю былым малалетнім вязням спецыяльны фонд нямецкага ўраду. Германія тры разы выплочвала грашовую кампенсацыю Валерыі Філіпаўне. А ў снежні 2005 года была арганізавана паездка былых малалетніх вязняў нямецкіх працоўных лагераў у Германію па месцах іх былых зняволенняў... Акцыю сумесна арганізавалі кіраўніцтва ФРГ і Беларускі фонд “Взаимопонимание и примирение”. Гераіне нашага даследавання ў 2005 годзе Беларускі фонд “Взаимопонимание и примирение” уручыў медаль “Узнику нацизма” (на фотаздымку).



... Цуды здараюцца заўсёды, іх проста трэба чакаць. У час паездкі ў Германію Валерыя Філіпаўна сядзела ў аўтобусе побач з жанчынай таго ж узросту. Разгаварыліся, і нечакана аказалася, што сядзела Валерыя Філіпаўна побач з  той самай Галяй, з якой 60 гадоў назад яны дзялілі драўляныя нары ў барачным адсеку! Гэта была тая самая Галіна Гавінчык, з якой Валерыя Палуянчык сфатаграфавалася ў Германіі ў 1945-ым годзе, а маці абодвух дзяўчынак адбывалі свой “працоўны” абавязак перад фашыстамі ў лагеры Будэльсдорф!

У Германіі былі цікавыя сустрэчы, паездкі, размовы. Была арганізавана і паездка ў той самы працоўны лагер... Праз 60 гадоў, вядома ж, усё змянілася. Амаль нічога ўжо не напамінала пра тое, што калісьці тут прайшло іх дзяцінства за калючым дротам.

Потым Валерыя Філіпаўна нейкі час перапісвалася з Галінай Уладзіміраўнай.

У хаце Валерыі Філіпаўны ў сямейным фотаархіве захоўваліся толькі два фотаздымкі з таго часу, зробленыя англійскімі салдатамі: 1945 год, Германія, дзве маці – Юзэфа Іванаўна Палуянчык і Дуня Гавінчык; дзеці – Валерыя і Косця, Галя са сваім братам...

... Пасля нямецкай няволі Валерыі Філіпаўне ніколі, ні аднаго разу не сніліся сны дзяцінства 1944-1945 г.г. у Германіі.



**Валерыя Філіпаўна Селязень**

# *IV. ПЕРАМОЖЦЫ*

## Баявыя шляхі нашых землякоў

### Кухта Генадзь Сямёнавіч: з партызанскіх лясоў да Берліна…



Жыццёвы лёс нашага земляка, Кухта Генадзія Сямёнавіча, жыхара вёскі Запруддзе, зараз прадстаўляецца дастойным для стварэння сюжэта мастацкай кінастужкі пра вайну, бо тое, праз што яму давялося прайсці ў тыя часы, якраз і ёсць сапраўдная гісторыя Вялікай Айчыннай…

Свой баявы шлях ён пачаў у жніўні 1943-га года ў складзе партызанскай брыгады "Жалязняк" радавым партызанам атрада № 1 у Бягомльскім раёне.

1 жніўня 1944 года "партызанскі этап" яго жыцця закончыўся; нейкі час ён нёс ахову палонных немцаў у вызваленым Мінску, а ў кастрычніку 1944-га Генадзь Сямёнавіч прызваны ў рады Савецкай Арміі і працягваў свой баявы шлях у складзе I Беларускага фронту – радзіст 771-га артылерыйскага палка.



Удостоверение участника БССР
ВРУЧЕНО
ПАСВЕДЧАННЕ № 232310
Кухта
Генадзій Сямёнавіч
удзельнічаў у партызанскім руху
Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай
з 13 жніўня 1943 г.
1 жніўня 1944 г. у якасці
радавога партызана
атрада № 1 брыгады
Старшыня выканкома
Савета

Удзельнічаў у баях за вызваленне Варшавы, прымаў удзел у фарсіраванні ракі Одэр, удзельнік штурму Берліна.

Узнагароджаны медалямі "За баявыя заслугі", "За ўзяцце Берліна", "За перамогу над Германіяй", ордэнам Чырвонай зоркі.

Вярнуўся ён дамоў на родную Глыбоччыну, у Запруддзе, толькі ў 1946-ым годзе.

У дакументальных архівах нашага школьнага гісторыка-краязнаўчага музея захоўваюцца яго запісаныя ўспаміны. Сярод гэтых запісаў асаблівую ўвагу прыцягвае расказ Генадзія Сямёнавіча пра апошнія дні вайны – штурм Берліна. Простыя словы пра тыя дні, калі вайна ўжо была на зыходзе, калі наперадзе ўжо была Перамога, але ж трэба было яшчэ выжыць…

Успаміны прыведзены так, як расказваў сам калісьці Генадзь Сямёнавіч.



Кухта Генадзь Сямёнавіч (першы злева). Дзейнічаючы фронт (зіма 1944-га)

*“…Асабліва запомнілася мне фарсіраванне ракі Одэр (фактычна, гэта быў пачатак бітвы за Берлін). Амаль тры роты нашых салдат загінула, пакуль не палажылі пантонныя масты. Пачалося наступленне. Мы занялі плацдарм: 600 метраў па фронту, 300 метраў у глыбіню. У Шчэціне былі адкрыты шлюзы, вада разлілася на 300-400 метраў. Плацдармы займалі на лодках.*



**Генадзь Сямёнавіч з сябрамі (Берлін, май 1945-га)**

*Хутка пераправа была за намі. Потым рушылі да Берліна. Да 28 красавіка падыйшлі да горада. Пачаліся вулічныя баі… Памятаю, як наблізіўшыся да нейкага будынка, метраў за 250, я ўпаў на зямлю, схаваўшыся за кола. Нямецкі снайпер узяў мяне на заметку і не даваў падняцца. Я надзеў пілотку на штык-нож, падняў крыху над колам і тут снайпер адразу ж яе прабіў куляй.*

*Так мне давялося праляжаць 4 гадзіны да наступлення цемнаты… Вакол рэйхстага ішлі жудасныя баі. Падключылі гарматы – 30 красавіка далі агонь па рэйхстагу. Але немцы не здаваліся.*

*1 мая кальцо вакол рэйхстага замкнулася. Я змогналічыць 16 калон і 32 ступенькі… Пасля чарговага артылерыйскага абстрэлу мы ўбачылі на адной са сцен рэйхстага кавалак тканіны белага колеру. Хвілін праз 10 немцы пачалі выходзіць з паднятымі кверху рукамі. Яны кідалі зброю. Усе зразумелі, што гэта – канец вайне…”.*



Вось так, проста і сціпла, гучалі ўспаміны Генадзія Сямёнавіча пра тыя апошнія дні вайны.

На адным з фотаздымкаў, што даслаў салдат дамоў родным летам 1945-га з Берліна, на зваротным баку маецца надпіс, які мы прыводзім іменна так, як яго надпісаў калісьці Генадзь Сямёнавіч:

***“На долгую память Дорогим Родителям пока я не вернусь. От вашего сына Кухто Генадия С. из города Берлина 9. VII. 45 года»***

**Кухта Васілій Міхайлавіч:**
**ён фатаграфаваўся на лесвіцы рэйхстага…**



Кухта Васілій Міхайлавіч, жыхар вёскі Запруддзе. Нарадзіўся ён у 1922 годзе на хутары Іванова Залескай гміны. Прызваны на фронт 15 ліпеня 1944 года. Вярнуўся дамоў у кастрычніку 1946-га і адразу пайшоў вучыцца. Набываў прафесію ветэрынарнага ўрача: вучыўся ў заатэхнікуме г. Шчучына.

Усё сваё дальнейшае працоўнае жыццё Васілій Міхайлавіч прысвяціў роднаму калгасу “Новы шлях”, дзе адпрацаваў 35 гадоў на пасадзе галоўнага заатэхніка.

Чалавек ён быў сціплы і стрыманы па характару, адказны за сваю справу, вельмі адукаваны. Мала хто ў нашых вёсках знаў аб тым, што Васілій Міхайлавіч прымаў удзел у штурме Берліна ў 1945-ым. Ведалі, што ён – удзельнік і ветэран Вялікай Айчыннай, але не бачылі, колькі у яго ўзнагарод. А герой нашага аповеду быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі “За адвагу”, “За вызваленне Варшавы”, “За баявыя заслугі”, “За ўзяцце Берліна”, “За перамогу над Германіяй”!

У свой час у Васілія Міхайлавіча былі запісаны ўспаміны аб вайне. У гэтых успамінах уражвае пунктуальнасць у дэталях і вострая памяць аб датах падзей, удзельнікам якіх быў герой нашага аповеду.

Успаміны захоўваюцца ў дакументальным архіве школьнага краязнаўчага музея. А сам тэкст нагадвае ваенную публіцыстыку былога афіцэра.

Перад Вамі яшчэ адзін узор сапраўдных успамінаў аб вайне…

*“…15 ліпеня 1944-га года мяне прызвалі ў армію. Спачатку ў суправаджэнні афіцэра нас даставілі на станцыю Аляхновічы, потым па чыгунцы направілі ў Смаленск. У Смаленску сфарміравалі 153-ці запасны полк і ў яго складзе нас накіравалі на Украіну.*

*6 лістапада 1944-га атрымалі абмундзіраванне, адпраўлены на Першы Прыбалтыйскі фронт у раён г. Елгава. У першы ж дзень прынялі баявое хрышчэнне. …Частка маіх землякоў загінула.*

*Далей зноў новы накірунак: адпраўлены на I Беларускі фронт пад Варшаву. Удзельнічаў у вызваленні польскай сталіцы. У канцы сакавіка 1945-га наш полк рушыў у раён горада Кюстрэн.*

*Пачатак красавіка мы правялі на вучэбных манеўрах па фарсіраванню водных перашкод, паколькі наперадзе быў Одэр. 15 красавіка пераправіліся на ужо заняты плацдарм на Одэры, а на наступны дзень пачалося генеральнае наступленне на нямецкую абарону. Паспяховаму правядзенню аперацыі садзейнічала моцная артпадрыхтоўка. Былі ўстаноўлены пражэктары для асляплення праціўніка. У час наступлення нямецкая абарона была прарвана.*

*У складзе танкавай дывізіі дайшлі да Берліна. 27 красавіка нашу роту папоўнілі да 120 чалавек. Пачаліся баі на вуліцах горада. Асабліва цяжка і страшна было ноччу. У горадзе была сканцэнтравана вялікая колькасць войск, так як фронт звузіўся. Па адной вуліцы рухалася некалькі дывізій.*

*Дайшлі да ракі Шпрэе. Мост праз раку быў умацаваны супрацьтанкавымі агароджамі. Я знаходзіўся ў будынку галоўнага паштамта Германіі і мог добра назіраць, што адбываецца на другім беразе. Пад прыкрыццём танкаў нам удалося прайсці мост, за якім пачынаўся апошні квартал горада перад рэйхстагам.*

*Наступленне нашай часці праходзіла якраз у накірунку рэйхстага. Я бачыў разбуранае швейцарскае пасольства, бачыў Трэптаў-парк з пасечанымі снарадамі дрэвамі, бачыў Брандэнбургскія вароты.*

*Ноччу, 2 мая, падыйшлі да цэнтральнага ўваходу ў рэйхстаг. Падцягнулі 76-мм пушкі – далі залп.*

*...Потым – капітуляцыя: немцы вывесілі белы сцяг, праз поўгадзіны выйшлі тры афіцэры, калона салдат, некалькі грамадзянскіх асоб. Палонных строілі ў калоны і адпраўлялі ў месцы дыслакацыі нашых войск.*

*Тры дні мы прастаялі каля рэйхстага ў ачапленні, чакалі прыезду Вярхоўнага галоўнакамандуючага. Хадзілі чуткі, што павінен быў прыехаць сам Сталін. Прыехаў камандуючы I Беларускім фронтам Георгій Жукаў: я яго бачыў на адлегласці ад сябе 50 метраў.*

*...Потым нас фатаграфіравалі на лесвіцы рэйхстага. Многія салдаты аставілі свае імёны і прозвішчы на сценах.*

*Наш батальён на машынах вывезлі на ўскраіны Берліна, дзе мы і адсвяткавалі Вялікую Перамогу".*

Вось такія рэальныя ўспаміны аб вайне і з'яўляюцца для нас, школьных краязнаўцаў, сапраўдным скарбам у справе зберажэння памяці аб тых людзях, якія бачылі тую вайну, прайшлі яе баявымі шляхамі і сталі Пераможцамі.



Смерть немецким оккупантам!

О НАШЕЙ ПОБЕДЕ, О НАШИХ ДЕЛАХ
ПУСТЬ СЛАВА ИДЕТ И ХРАНИТСЯ В ВЕКАХ!

Приказом Верховного Главнокомандующего Маршала Советского Союза товарища Сталина от 2 мая 1945 года № 359

за овладение столицей Германии городом

БЕРЛИН

всему личному составу нашего соединения, в том числе и Вам, принимавшему участие в боях,

объявлена благодарность.

Командир части

**Узнагароды-падзякі Кухта Генадзія Сямёнавіча:**
**"За ўзяцце сталіцы Германіі" (02.05.1945 г.);**
**"За ўступленне ў Берлін" (23.04.1945 г.)**



Красноармейцу

Кухта Геннадий Семенович

Приказом Верховного Главнокомандующего Маршала Советского Союза товарища Сталина

от 23 апреля 1945 г. № 339

за вступление в город Берлин

всему личному составу нашего соединения, в том числе и Вам, принимавшему участие в боях, ОБ'ЯВЛЕНА БЛАГОДАРНОСТЬ.

КОМАНДИР ЧАСТИ (подпись)

Мы в битвах решали судьбу поколений,
Мы к славе отчизну свою повели!

## *ПАСЛЯСЛОЎЕ*

### Дарогамі памяці. Помнікі сведчаць…

На тэрыторыі Залескага сельсавета налічваецца сем помнікаў, прысвечаных памяці нашых землякоў, загінуўшых у часы Вялікай Айчыннай вайны. Усе яны адзначаны на карце, змешчанай на апошняй старонцы нашага даследавання.

***Помнік у в. Запруддзе** (устаноўлены ў 1974 г.).

***Памятная стэла ў гонар партызан атрада імя Ахоціна ў в. Залессе-Астроўна /Двор Залессе/** ( узведзена ў 1975 г.).

***На могілках каля в. Зубкі размешчаны помнік на месцы пахавання невядомага салдата.**

***Помнік землякам у в. Лучайка** (устаноўлены ў 1985 г.).

***Помнік на месцы расстрэлу сям'і Мірош Нікандра Іванавіча** (знаходзіцца ў полі за в. Лучайка).

***Помнік на месцы расстрэлу сям'і Жука Уладзіміра Ігнатавіча** (знаходзіцца пры дарозе паміж в.в. Сасноўка і Дылевічы).

***Помнік землякам у в. Капыльшчына** (устаноўлены на месцы ранейшага у 2014 г.).

У Залескай сярэдняй школе ў гісторыка-краязнаўчым музеі "Мінулае Залесчыны" створаны і працуе **экспазіцыйны аддзел "Вызваленне і Перамога"**, прысвечаны нашым землякам, якія ваявалі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

…Усё гэта – і ёсць дарогі памяці, на прыпынках якіх – каля гэтых помнікаў – мы ўспамінаем тых, хто аддаў сваё жыццё за светлае нашае будучае.



**Залесчына.**
**Помнікі загінуўшым землякам**
**у  часы Вялікай Айчыннай вайны**


















